**Бігеза В.М.,** *дацэнт*

# СІСТЭМА ДАПАМОЖНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК СРОДАК ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўмовах перабудовы грамадскіх і эканамічных адносін перад бібліятэкамі рэспублікі ставіцца задача паляпшэння даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, выкарыстання ўсіх відаў інфармацыі.

Спажыванне бібліяграфічнай інфармацыі цесна звязана з усебаковым вывучэннем і выкарыстаннем сістэмы бібліяграфічных дапаможнікаў.

На сучасным этапе бібліятэкі маюць магчымасць уключаць у рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі ўсе лепшыя творы, якія заслугоўваюць увагі з пункту гледжання агульначалавечых каштоўнасцей, распрацоўваць новыя тэарэтычныя асновы сістэмы рэкамендацыйных і навукова-дапаможных паказальнікаў.

Аналіз масіву бібліяграфічных паказальнікаў па дзіцячай літаратуры, створанага бібліятэкамі рэспублікі, сведчыць аб тым, што бібліяграфічныя рэсурсы гэтай галіны складаюцца часткова з асобна выдадзеных бібліяграфічных дапаможнікаў, прыкніжных і прыартыкульных спісаў, неапублікаваных бібліяграфічных матэрыялаў.

Найбольшае развіццё ў рэспубліцы атрымала навукова-дапаможная літаратурная бібліяграфія. Значнае месца ў ёй займаюць агульныя навукова-дапаможныя паказальнікі выданняў беларускай мастацкай літаратуры (у тым ліку і дзіцячай), якія выйшлі ў рэспубліцы, перакладаў твораў літаратуры блізкага і далёкага замежжа на беларускую мову і інш.

У даведачна-бібліяграфічнай рабоце для персанальных пошукаў карысным з'яўляецца бібліяграфічны слоўнік «Беларускія пісьменнікі» ў шасці тамах, які падрыхтаваны супрацоўнікамі Інстытута літаратуры АН РБ.

Шырокае распаўсюджанне ў беларускай літаратурнай бібліяграфіі атрымалі і персанальныя паказальнікі, прысвечаныя выдатным мастакам слова. Гэта найбольш развітое звяно падсістэмы навукова-дапаможных паказальнікаў. Літаратура для дзяцей тут выдзелена ў асобныя раздзелы. Гэта, напрыклад, паказальнікі, прысвечаныя Я.Коласу, Я.Купалу, М.Багдановічу і інш. І ўсё ж, нягледзячы на бясспрэчныя дасягненні, у падсістэме персанальных бібліяграфічных паказальнікаў па беларускай дзіцячай літаратуры назіраюцца істотныя недахопы: адсутнічаюць паказальнікі, прысвечаныя паэтам і пісьменнікам, якія ўсю сваю творчасць прысвяцілі менавіта дзецям (Я.Маўр, А.Якімовіч, С.Шушкевіч, Э.Агняцвет і інш.).

У сістэме дапаможнікаў па беларускай дзіцячай літаратуры значнае месца займаюць рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі. З 1946 г. кожнае пяцігоддзе выдаецца паказальнік «Дзіцячая літаратура Беларусі» (ранейшая назва «Дзіцячая літаратура БССР»), у якім прадстаўлены ўвесь паток літаратуры для дзяцей: мастацкая літаратура і фальклор, выдадзеныя ў Беларусі, кнігі беларускіх пісьменнікаў, перакладзеныя на рускую мову, дзіцячая літаратура Беларусі, выдадзеная на замежных мовах, навукова-папулярная літаратура і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыя аб навінках беларускай дзіцячай літаратуры, лепшых творах літаратур блізкага і далёкага замежжа прадстаўлена ў штогодніку «Беларуская мова, літаратура, мастацтва» (ранейшая назва «Літаратура і мастацтва БССР»). Шырокае распаўсюджанне атрымалі ў рэспубліцы рэкамендацыйныя агляды, спісы, апублікаваныя ў бюлетэні «Новыя кнігі Беларусі».

Неабходна адзначыць, што ў сістэме бібліяграфічных дапаможнікаў па беларускай дзіцячай літаратуры значная роля адводзіцца метадыка-бібліяграфічным дапаможнікам, складзеным Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэкай.

Пэўную частку бібліяграфічнага масіву па беларускай дзіцячай літаратуры складаюць прыкніжныя і прыартыкульныя спісы літаратуры, якія змешчаны ў тэарэтычных даследаваннях па гісторыі развіцця дзіцячай літаратуры ў цэлым, яе асобных жанраў, сувязей з іншымі літаратурамі.

На сучасным этапе значнае месца ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні чытачоў займаюць неапублікаваныя бібліяграфічныя спісы і картатэкі, дзе адлюстравана і дзіцячая літаратура. Найбольш распаўсюджаная форма бібліяграфічнай інфармацыі аб неапублікаваных бібліяграфічных матэрыялах - спісы літаратуры, у якіх прадстаўлена інфармацыя аб кнігах, часопісных і газетных артыкулах. Асноўнымі спажыўцамі гэтай інфармацыі з'яўляюцца спецыялісты ў галіне дзіцячай літаратуры, кіраўнікі дзіцячага чытання.

На наш погляд, адна з першачарговых задач бібліятэк рэспублікі сёння - гэта падрыхтоўка персанальных і тэматычных рэкамендацыйных дапаможнікаў у галіне дзіцячай літаратуры, якія будуць садзейнічаць выкананню тэматычных, праблемна-тэматычных запытаў чытачоў, іх духоўнаму, эстэтычнаму, грамадзянскаму станаўленню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ